Сказ пра Мураша-лайдака

Генадзь Аўласенка

Пад ялінай у цішы, працавалі мурашы. Працавалі без ляноты і з вялікаю ахвотай ад світанка да змяркання: той ідзе на паляванне, той мурашнік рамантуе, той вячэру ўсім гатуе... Словам, кожны справу меў, так, без справы, не сядзеў.

Ды завёўся, скажам так, сярод іх адзін лайдак. Для сваёй агульнай хаты той Мураш гультаяваты анічога не рабіў. Спаў, ды еў, ды лынды біў.

Доўга мурашы трывалі: і прасілі, і ўшчувалі. Яны й гэтак, яны й так – ды не слухае лайдак!

Тут агульны сход сабрала мурашыная сям'я і з мурашніка прагнала назаўсёды гультая. Як сказалі – так зрабілі. За каршэнь яго схапілі мурашы-вартаўнікі і да брамы напрасткі прыцягнулі, шуганулі і вароты зноў замкнулі.

— Прэч, — сказалі, — абібок, у які жадаеш бок! Або ўлева, дзе ручай, а за ім зялёны гай. А не хочаш — тады ўправа, дзе балота ды канава. Там жыві хоць у вадзе, хоць на дрэве, хоць нідзе! Толькі знікні прэч з вачэй! І хутчэй!

Стаў Мураш сяброў прасіць пакаранне адмяніць, каб дазволілі застацца. Абяцаў не ленавацца. Толькі б зноў назад вярнуцца, толькі б дома апынуцца, толькі б трапіць у жытло...

Але не дапамагло. Не пусціла гультая мурашыная сям'я. І пайшоў бядак управа, дзе балота і канава, у канаву каб упасці ды ў канаве той прапасці.

Раптам бачыць: скача Жук, а на ім сядзіць Павук, ды як крыкне Мурашу: «Сцеражыся! Раздушу!». Ледзь паспеў Мураш адскочыць, ледзь паспеў з дарогі збочыць, але тут спыніўся Жук, ці яго спыніў Павук. Паглядзеў на бедака і пытае лайдака: хто ён і куды ідзе, і ў якой-такой бядзе апынуўся небарака? У адказ Мураш заплакаў, ля дарогі прыпыніўся і ў ляноце павініўся.

А Павук як рассмяецца, Жук пад ім як узаўецца! Уцякаць Мураш пачаў, ды Павук яго дагнаў, за каршэнь рукой схапіў, павуцінай абкруціў, да сядла прымацаваў... ну а потым так сказаў:

— У мяне ты будзеш жыць, будзеш мне цяпер служыць! Я прымушу працаваць: будзеш ежу гатаваць, будзеш вокны праціраць і кватэру прыбіраць. Як пратрэш ды прыбярэш – можа трошкі й адпачнеш... так, хвілінак, можа, з пяць... Ну а потым – хопіць спаць! Уставай, далей працуй: дзіркі ў сетках зацыруй,

ChitaemDetyam.com

потым выбі дываны, бо ўжо брудныя яны. Прынясі вады з крыніцы, каб Жуку было напіцца, накасі яму травы, ды зялёнай муравы, потым дровы пасячы... Ды не ўздумай уцячы! Даганю – не пашкадую: з цябе страву прыгатую! Не адну, а цэлых пяць, каб гасцей пачаставаць...

Так і стаў Мураш служыць, у палоне цяжкім жыць. Ды баяўся ленавацца, толькі каб жывым застацца! Устае ён спазаранку, аж задоўга да світанку, гне спіну да самай ночы... а Павук над ім рагоча, працу новую дае, што не так — па карку б'е. А як надакучыць біць – скажа ўсё перарабіць! Дзень за днём ідзе, бяжыць... Мурашу гаротна жыць!

Вось і лета прамінула, вось і восень прамільгнула. Вось у лес зіма прыйшла, гурбы снегу намяла. Маразы трашчаць, лютуюць, са звярамі не жартуюць, гоняць кожнага ў жытло... І мурашнік замяло, аж да самай верхавіны. Ды мурашкам не ў навіну — пад зямлёю, да вясны, спяць яны і бачаць сны.

Толькі наш Мураш батрачыць, свету белага не бачыць, робіць, хоць і без ахвоты, разнастайную работу. Быў калісьці лайдаком — стаў такім працаўніком.

А затым зіма прайшла, зноў у лес вясна прыйшла і блакітныя пралескі параскідвала па ўзлесках. Птушкі весела спяваюць, дрэўцы дружна ажываюць, наваколле расквітнела, ажыло, зазелянела. І мурашнік пад вясну ажывае пасля сну, і працуюць ад душы пад ялінай мурашы.

Стаў Мураш наш сумаваць, стаў сяброў успамінаць. Вось бы зноў да іх вярнуцца, вось бы дома апынуцца! Больш не стаў бы лынды біць, стаў бы, як усе, рабіць! Толькі, як туды дабрацца, як з палону ўратавацца?

Доўга наш Мураш вагаўся, вельмі ж Павука баяўся. І рашыў сярод начы ён ціхенечка ўцячы. Выпаўз з цёмнае каморкі, асцярожна вылез з норкі, асядлаў хутчэй Жука ды і прэч ад Павука!

Паскакаў па лесе Жук — ды пачуў той стук Павук. За Жуком услед імчыць, Мурашу здалёк крычыць:

— Ну, чакай! Калі злаўлю — дзесяць страў з цябе зраблю! Так што зараз жа спыніся, нізка ў ножкі пакланіся, зноў вярніся мне служыць! А інакш — табе не жыць!

Хоць Мураш яго пачуў, ды Жука не павярнуў. Жук бяжыць, зямля дрыжыць, на Жуку Мураш ляжыць. За вусы трымаецца, у бакі матляецца, не ўзнімае галавы і ад страху ледзь жывы.

Хутка бег па лесе Жук, не дагнаў яго Павук. Прыпыніўся ён, стаміўся... ды Мураш з Жука звалiўся! Ён звалiўся і

ляжыць... да яго Павук бяжыць, кулакі свае ўздымае, Мураша вось-вось спаймае, каб ім потым павячэраць... вось ужо і зубы шчэрыць! А Мураш, калі звaліўся, моцна аб зямлю пабіўся і цяпер устаць не можа. І ніхто не дапаможа!

Але побач, у бары, мурашы, яго сябры, ці то проста працавалі, ці здабычу ўпалявалі. Як убачылі нябогу — дык хутчэй на дапамогу. Падхапілі бедака, адагналі Павука.

Так Мураш-бядак ізноў напаткаў былых сяброў, побач з імі апынуўся, у мурашнік свой вярнуўся. Больш ужо не ленаваўся, працаваць заўжды стараўся. Працу ўсякую рабіў і мурашнік свой любіў.